ПРЭЗІДЫУМ АШМЯНСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ

АШМЯНСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

# РАШЭННЕ

24 лістапада 2017 г. № 134/829

Аб утварэнні Ашмянскай раённай выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць восьмага склікання

Разгледзеўшы пратаколы сходаў кіруючых органаў арганізацыйных структур грамадскіх аб'яднанняў, заявы грамадзян аб вылучэнні прадстаўнікоў у склад Ашмянскай раённай выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць восьмага склікання, на падставе часткі дзевятай артыкула 24, артыкула 34 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь прэзідыум Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў і Ашмянскі раённы выканаўчы камітэт ВЫРАШЫЛІ:

1. Утварыць Ашмянскую раённую выбарчую камісію па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць восьмага склікання колькасцю 11 чалавек у наступным складзе:

Буйвід Юрый Фабіянавіч, вылучаны Ашмянскай раённай арганізацыяй рэспубліканскага грамадскага аб’яднання “Белая Русь”;

Вінцаловіч Ганна Мартынаўна, вылучана Ашмянскай раённай арганізацыяй Беларускага грамадскага аб’яднання ветэранаў;

Жылік Сяргей Аляксандравіч, вылучаны Ашмянскай раённай арганізацыяй прафсаюза Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму;

Карповіч Юрый Міхайлавіч, вылучаны шляхам падачы заявы грамадзян;

Ластоўская Валянціна Іванаўна, вылучана Ашмянскай раённай арганізацыяй прафсаюза Беларускага прафесійнага саюза работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў;

Прахарэнка Ірына Леанідаўна, вылучана шляхам падачы заявы грамадзян;

Саванец Аляксандр Анатольевіч, вылучаны Ашмянскай раённай прафсаюзнай арганізацыяй работнікаў адукацыі і навукі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі;

Тарашкевіч Вольга Тадэвушаўна, вылучана Ашмянскай раённай арганізацыяй грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын";

Шыдлоўская Вольга Леанідаўна, вылучана Ашмянскай раённай арганізацыяй грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі";

Юнашка Ала Іосіфаўна, вылучана Ашмянскай раённай арганізацыяй грамадскага аб'яднання "Беларускі фонд міру";

Ярашэвіч Уладзімір Іванавіч, вылучаны шляхам падачы заявы грамадзян.

2. Устанавіць, што Ашмянская раённая выбарчая камісія па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць восьмага склікання размяшчаецца па адрасе: г. Ашмяны, вул. Савецкая, 103, каб. № 28, 34, тэл. 43927.

3. Упаўнаважыць прадстаўніка Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта абараняць інтарэсы Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта і прэзідыума Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў у судзе ў выпадку абскарджання дадзенага рашэння ў судовым парадку.

4. Вызначыць 24 лістапада 2017 г. датай правядзення першага арганізацыйнага пасяджэння Ашмянскай раённай выбарчай камісіі па выбарах депутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць восьмага склікання.

Старшыня Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў

М.У.Квяткевіч

Старшыня Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта

М.Э.Сарасек

Кіраўнік спраў Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта

А.І.Юнашка